Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай»
____________ Ю.Я. Раманоўскі
«30» ___06___ 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-310/23 /уч.

**МОДУЛЬ «АГУЛЬНАПРАФЕСІЙНЫ»**
**БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА**
Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

6-05-0232-04 Рамана-германская філалогія

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0232-04 «Рамана-германская філалогія» ад 04.04.2023, рэгістрацыйны № 06-23/уч. ГФ

СКЛАДАЛЬНІК:

Т.Р. Багарадава, дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

(пратакол № 9 ад 09.06.2023)

Метадычнай камісіяй гуманітарнага факультэта ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

(пратакол № 10 ад 27.06.2023)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны «Беларуская літаратура» прызначана для студэнтаў першага курса ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай» спецыяльнасці 6-05-0232-04 «Рамана-германская філалогія» і з'яўляецца дысцыплінай па выбару агульнапрафесійнага модуля.

Дадзеная вучэбная дысцыпілна заклікана адыграць пазітыўную ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, у прапагандзе дасягненняў і набыткаў нацыянальнага мастацтва слова.

На сучасным этапе працягваецца пераасэнсавнне мастацкіх з'яў, у актыўны разгляд уключаны многія невядомыя раней творы як мінулых эпох, так і сучаснасці,выпрацоўваюцца новыя крытэрыі ацэнкі.

У сучасным літаратуразнаўстве усталяваліся новыя падыходы, канцэпцыі, прыярытэты. Аднавілася аб'ектыўная карціна гістарычнага развіцця нацыянальнага мастацтва слова, беларуская літаратура XX стагоддзя разглядаецца як цэласны гісторыка-культурны працэс, па-іншаму выглядае перыядызацыя.

Праграма арыентуе на канцэптуальнае навуковае разуменне беларускай літаратуры, яе ідэйна-эстэтычнага руху, нацыянальнай спецыфікі, мастацкіх формаў адлюстравання і светапазнання, жанрава-стылёвых тэндэнцый развіцця, спасціжэнне гуманістычнай філасофіі і засваенне духоўных каштоўнасцей, якія закладзены ў творах класічнай спадчыны і сучасных майстроў слова. Галоўная мэта вучэбнага курса: раскрыць разнастайнасць і асаблівасці гісторыка-літаратурнага працэсу, пачынаючы са старажытнасці і да пачатку XXст.

Праграма перш за ўсё скіравана на працэс ўдасканалення асобы, выхаванне ў маладога пакалення асноў сістэматызавання ведаў, напрацоўку новых падыходаў да выкладання літаратуры, а таксама на развіццё творчага мыслення студэнтаў, актывізацыю іх навукова-даследчага пошуку.

## 1. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**1.1. Мэты выкладання дысцыпліны:**

Галоўная мэта – пазнаёміць студэнтаў з этапамі развіцця нацыянальнай літаратуры.

**Мэты курса:**

-даць уяўленне пра агульныя напрамкі развіцця літаратуры;
-даць уяўленне пра змену мастацка-светапоглядных сістэм, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанравых формаў;
-прааналізаваць жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, змест іх твораў, месца і ролю ў літаратурным працэсе.

**1.2. Задачы вывучэння дысцыпліны:**

-даць студэнтам рознабаковыя веды па прадмеце;
-навучыць арыентавацца ў свеце мастацкіх твораў;
-сфармаваць навыкі аналізу літаратурнага тэксту;
-выпрацаваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці мастацкіх твораў;
-выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

**1.3. У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Беларуская літаратура» студэнт павінен:**

**ведаць:**

-шляхі і асноўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры;
-канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў, сучасныя ацэнкі мастацкіх з'яў папярэдніх эпох, праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці сюжэту і кампазіцыі, асаблівасці іх кампазіцыі і вобразна-мастацкіх сродкаў;

**умець:**

-сумяшчаць тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных літаратурных з'яў, вызначаць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу;
-каментаваць тэксты твораў, характарзуючы іх з культуралагічнага, гісторыка-бытавога, літаратуразнаўчага і іншых пунктаў погляду;

**валодаць:**

-адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам;
-сучаснай метадалогіяй і методыкай навуковых даследаванняў, навыкаў розных спосабаў аналізу мастацкага тэксту.

**Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста**

- СК-8: Валодаць вуснай і пісьмовай разнастайнасцямі беларускай/рускай літаратурнай мовы, карыстацца асноўнымі моўнымі паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца 90 акадэмічных гадзін, з іх 42 гадзіны – на аўдыторныя заняткі (лекцыі – 18 гадзін, практычныя заняткі – 24 гадзіны), 48 гадзін – на самастойную працу студэнтаў. Працаёмкасць – 3 з.а.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца ў 1 сяместры.

Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Літаратура эпохі Сярэднявечча XII-XV ст.** Асноўныя тэмы, ідэі, вобразы, аўтары дадзенай пары. Ананімная літаратура.

**Тэма 2. Літаратура эпохі Адраджэння.** Літаратура эпохі Вялікага княства Літоўскага: асноўныя аўтары, жанры,творы.

**Тэма 3. Літаратура пераходнага перыяду.** Ананімная літаратура. Аўтары, творы, жанры.

**Тэма 4. Літаратура пераходнага перыяду.** Ананімная літаратура. Аўтары, творы, жанры.

**Тэма 5. Пачатак і вытокі станаўлення новай беларускай літаратуры.** Станаўленне новай беларускай літаратуры: пошук нацыянальнага аблічча, зместу і формаў яго выяўлення; выпрацоўка новай літаратурнай мовы, выяўленчых сродкаў, стыляў. Мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі развіцця: травесційна-бурлескная, этнаграфічна-фальклорная. Дэмакратычны змест і пафас НБЛ.

**Тэма 6. Дарэформенны перыяд новай беларускай літаратуры. Літаратура першай паловы XIX ст. Мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі і этапы развіцця.** Прычыны неканкрэтнасці эстэтычна-стылявых прыкмет. Мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі: травесційна-бурлескная, этнаграфічна-фальклорная, рэалістычна-публіцыстычная.

**Тэма 7. Фальклорныя традыцыі новай беларускай літаратуры.** Жыццёвы і творчы шлях А. Рыпінскага, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, Т. Лады-Заблоцкага.

**Тэма 8. Паслярэформенны перыяд новай беларускай літаратуры.** Грамадстка-палітычныя падзеі і працэсы, якія паўплывалі на развіццё літаратуры. Фармаванне асноўных цэнтраў літаратурнага руху. Віцебскае грамадска-культурнае асяроддзе. Мінск як крыніца грамадска-культурнага жыцця. Дзейнасць В. Савіча-Заблоцкага і Ф. Тапчэўскага. В.І. Дунін-Марцінкевіч

Асоба пісьменніка, асаблівасці светапогляду. Дэмакратызм і асветніцтва. Беларуская літаратура 90-х гг. Агульная характарыстыка часу, развіццё грамадска-палітычнай думкі.

**Тэма 9. Развіццё беларускай літаратуры ў пачатку XX ст.** Перыядычны друк. Дзейнасць газет “Наша Доля” і “Наша Ніва”. Асноўныя выдавецтвы і перыядычныя выданні. Адраджэнская палітыка нашай краіны.

**Тэма 10. Дзейнасць майстроў слова: Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі.** Палітыка беларусізацыі. Адкрыццё нацыянальных тэатраў, ІнБелКульта, БДУ. Развіццё перыёдыкі і друку. Узнікненне таварыстваў і друкарняў.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**
**Форма атрымання адукацыи – дзённая**

| Нумары раздзелаў, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | літаратура | формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая (кантралюемая)СПС | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 8 | 9 |
| 1. | Літаратура эпохі Сярэднявечча XII-XV ст. | 2 | | | | 1-3 | вуснае апытанне |
| 2. | Літаратурная спадчына К.Тураўскага | 2 | | | | 1-3 | вуснае апытанне |
| | Практычныя заняткі: “Кірыла Тураўскі і яго літаратурна спадчына” | | 2 | | | 1-6 | вуснае апытанне |
| | Ф.Скарына я яго час | | 2 | | | 1-3 | вуснае апытанне |
| 3. | Літаратура эпохі Адраджэння. | 2 | | | | 1-3 | вуснае апытанне |
| | Практычныя заняткі: “Асноўныя дзеячы эпохі Адраджэння і іх літаратурны лёс” | | 2 | | | 1-3 | пісьмовае апытанне |
| 4. | Літаратура пераходнага перыяду | 2 | | | | 1-3 | вуснае апытанне |
| | Асноўныя памятнікі пісьменства пераходнага перыяду | | 2 | | | 1-3 | пісьмовае апытанне |
| 5. | Пачатак і вытокі станаўлення новай беларускай літаратуры | 2 | | | | 1-4 | тэст* |
| | Бурлескна-травесційная паэма “Энеіда навыварат” і яе роля ў станаўленні беларускай літаратуры | | 2 | | | 1-3 | тэст* |
| | “Тарас на Парнасе”і аўтарства паэмы | | 2 | | | | тэст* |
| 6. | Дарэформенны перыяд новай беларускай літаратуры. Літаратура першай паловы XIX ст. Мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі і этапы развіцця. | 2 | | | | 1-5 | вуснае апытанне |
| | Роля творчай спадчыны П. Багрыма | | 2 | | | 1-3 | пісьмовае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7. | Фальклорныя традыцыі новай беларускай літаратуры. Творчасць Я. Чачота | | 2 | | | 1-3 | вуснае апытанне |
| | Творчасць Я. Баршчэўскага як вяршыня рамантызму на Беларусі. | | 2 | | | 1-8 | пісьмовае апытанне |
| 8. | Паслярэформенны перыяд новай беларускай літаратуры | 2 | | | | 1-3 | вуснае апытанне, практычныя заданні |
| | Творчая спадчына Ф. Багушэвіча. | | 2 | | | 1-3 | вуснае апытанне, практычныя заданні |
| 9. | Развіццё беларускай літаратуры ў пачатку XX ст. | 2 | | | | 1-8 | тэст* |
| | Развіццё перыёдыкі і друку. | | 2 | | | 1-3 | тэст* |
| 10. | Дзейнасць майстроў слова: Я. Купалы, Я. Коласа. Асаблівасці творчай спадчыны М. Багдановіча, Цёткі. | 2 | | | | 1-3 | вуснае апытанне |
| | Развіццё беларускага сімвалізму | | 2 | | | 1-7 | вуснае апытанне |
| | **Усяго:** | **18** | **24** | | | | |

*мерапрыемствы бягучага кантролю

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## ЛІТАРАТУРА

### АСНОЎНАЯ


1. Баршчэўскі, Л.П. Беларуская літаратура і свет / Л. П. Баршчэўскі, П. В. Васючэнка, М. А. Тычына; пад рэд. Л. П. Баршчэўскага. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – 576 с.
2. Бурдзялёва, І.А. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзяў: майстры, плыні, традыцыі: курс лекцый / І. А. Бурдзялёва. – Мінск : МДЛУ, 2009. – 168 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры: у 4 т. / рэдкал.: У. В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 4 т.
4. Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў. У 2 т. Т.2 - Новая літаратура: другая палова XVIII - XIX стагоддзе / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. тома У.І. Мархель, В.А. Чамярыцкі. – Мн. : Бел. навука, 2007. – 582 с.
5. Запрудскі, І.М. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя / І. М. Запрудскі. – Мн., 2003. – 138 с.
6. Кавалёў, С.В. Гісторыя беларускай літаратуры: другая палова XVI ст.: курс лекцый / С.В. Кавалёў. — Мінск: БДУ, 2005. – 110 с.
7. Некрашэвіч-Кароткая, Ж.В. Шматмоўная літаратура Беларусі ў кантэксце актуальных літаратуразнаўчых канцэпцый : дапаможнік / Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая – Мінск : БДУ, 2015. – 207 с.
8. Хаўстовіч, М.В. Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст.: Дапаможнік для студэнтаў філал. спец. вышэйш. навуч. устаноў / М В. Хаўстовіч. – Мн.: БДУ, 2001. – 171 с.


### ДАДАТКОВАЯ


1. Старажытная беларуская літаратура / рэдкал. : Ю. А. Місюль (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск, : Вышэйшая школа, 2022. – 368 с.


### НАГЛЯДНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ

Мультымедыя ў пакетах Microsoft Office, Windows Media.

# ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАЛІКА

1. Развіццё беларускай літаратуры ў XIII – IV ст.
2. Жанравыя асаблівасці твораў К. Тураўскага.
3. Творчая спадчына Ф. Скарыны.
4. М. Гусоўскі і яго творчасць у кантэксце еўрапейскай літаратуры.
5. Асаблівасці ўзнікнення і развіцця новай беларускай літаратуры. Асноўныя літаратурныя напрамкі XIX – пач. XX стст.
6. Ідэйна-мастацкі аналіз паэмы В. Равінскага "Энеіда навыварат".
7. Адметнасці жыццядзейнасці, праблематыка і ідэйная накіраванасць творчай спадчыны беларуска-польскіх пісьменікаў (А. Рыпінскі, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, Т. Лада-Заблоцкі, А. Міцкевіч).
8. Літаратурны працэс 1850-60-х гг. XIX ст.: жанравая спецыфіка і праблематыка. Творчасць А. Вярыгі-Дарэўскага, А.Кіркора, У. Сыракомлі, В. Каратынскага.
9. Гісторыя аўтарства і ідэйна-мастацкія асаблівасці паэмы К. Вераніцына "Тарас на Парнасе".
10. Драматургічная і вершаваная спадчына В.І. Дуніна-Марцінкевіча (п'есы "Ідылія", "Пінская шляхта", "Залёты"; вершаваныя аповесці "Гапон", "Вечарніцы").
11. Літаратурны рух і сацыяльна-палітычная атмасфера паслярэформеннага часу. Беларуская публіцыстыка (К. Каліноўскі).
12. Асветніцкі рэалізм у творчасці Ф. Багушэвіча.
13. Жыццёвы шлях Я. Купалы. Значэнне яго творчасці (паэтычная і драматургічная спадчына пачатку XX ст.).
14. Жыццёвы і творчы шлях, светапогляд Я. Коласа ў паэзіі дакастрычніцкага часу (вершы і паэмы).
15. Філасофскія і эстэтычныя тэндэнцыі прозы Я. Коласа ("Казкі жыцця").
16. Маральная праблематыка прозы Ядвігіна Ш..
17. Аналітычны псіхалагізм творчай спадчыны М. Гарэцкага.
18. М. Багдановіч як паэт-сімваліст. Ідэйна-мастацкі аналіз зборніка "Вянок".

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

**Змест самастойнай працы студэнтаў**
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| Від самастойнай працы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 5 | **Асаблівасці дарэформеннага перыяду развіцця новай беларускай літаратуры.** Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме “Дзейнасць Ф. Тапчэўскага ў кантэксце развіцця беларускай літаратуры” **Літаратура:** да ўсіх тэм асноўная літаратура – Кавалёў, С.В. Гісторыя беларускай літаратуры: другая палова XVI ст.: курс лекцый / С.В. Кавалёў. — Мінск: БДУ, 2005. – 110 с. Некрашэвіч-Кароткая, Ж.В. Шматмоўная літаратура Беларусі ў кантэксце актуальных літаратуразнаўчых канцэпцый : дапаможнік / Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая – Мінск : БДУ, 2015. – 207 с. Хаўстовіч, М.В. Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст.: Дапаможнік для студэнтаў філал. спец. вышэйш. навуч. устаноў / М В. Хаўстовіч. – Мн.: БДУ, 2001. – 171 с. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 5 | **Дзейнасць беларуска-польскіх пісьменнікаў.** Складанне прэзентацыі пра літаратурную дзейнась беларуска-польскіх аўтараў. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 5 | **Ян Баршчэўскі і Беларусь.** Характарыстыка міфалагічных вобразаў паводле твора “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях і казках яе” | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 5 | **Ананімная літаратура 19 ст.** Складанне плана-канспекта лекцыі па тэме:”Асаблівасці развіцця ананімных твораў ў 19 ст” | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 7 | **Дзейнасць В. Дуніна-Марцінкевіча.** Складанне прэзентацыі “Адметнасці вершаванай спадчыны В. Дуніна-Марцінкевіча. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 7 | **Дзейнасць В. Дуніна-Марцінкевіча.** Складанне плана-канспекта “Драматургія В. Дуніна-Марцінкевіча. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 7 | **Дзейнасць Віцебскага гуртка.** Складанне бібіліяграфіі беларускіх пісьменнікаў, якія прымалі ўдзел у працы гуртка. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 7 | **Дзейнасць Мінскага гуртка.** Разгляд і аналіз твораў беларускіх пісьменнікаў-удзельнікў гуртка. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 8 | **Літаратура часу паўстання К. Каліноўскага.** Літаратурна-мастацкі аналіз твораў “Мужыцкая праўда” і “Ліст з-пад шыбеніцы”. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 8 | **Ананімныя паўстанская літаратура.** Складанне плана-канспекта з пералікам літаратурных твораў (ананімных паўстанскіх вершаў і песень) перыяду паўстання К. Каліноўскага. | 4 |
| Паглыбленае | **Беларуская эміграцыя.** | 4 |

| | | |
|---|---|---|
| вывучэнне тэмы 9 | Складанне прэзентацыі "Беларуская пісьменнікі-эмігранты пачатку XX ст". | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 9 | **Літаратура Беласточчыны.** Складанне прэзентацыі "Асноўная тэматыка твораў беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны". | 4 |
| **Усяго** | | **48** |

## КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

Дыягностыка кампетэнцый студэнтаў ажыццяўляецца падчас выступу студэнтаў на практычных занятках, правядзення тэстаў па асобных раздзелах вучэбнай дысцыпліны, вуснага апытання падчас практычных заняткаў, абароны рэфератаў, здачы заліку.

У рамках рэйтынгавай сістэмы паспяховасць студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне ацэньваецца з дапамогай мерапрыемстваў бягучага кантролю, якія праводзяцца на працягу семестра. Мерапрыемствы бягучага кантролю праводзяцца ў час аўдыторных заняткаў. Адзнакі, атрыманыя студэнтам у ходзе бягучага кантролю, выстаўляюцца па дзесяцібальнай шкале і фіксуюцца ў журнале выкладчыка. Для студэнта, які прапусціў мерапрыемства бягучага кантролю па ўважлівай прычыне, кафедрай устанаўліваюцца дадатковыя тэрміны. Студэнтам, якія прапусцілі мерапрыемства бягучага кантролю без уважлівай прычыны, выстаўляецца 0 (нуль) балаў за гэтае мерапрыемства.

Вынік бягучага кантролю за семестр ацэньваецца адзнакай у балах па дзесяцібальнай шкале і выводзіцца зыходзячы з адзнак, выстаўленых выкладчыкам (выкладчыкамі) падчас правядзення мерапрыемстваў бягучага кантролю на працягу семестра. Дадзеная адзнака таксама ўлічвае вынікі ўдзелу студэнта ў навукова-практычных мерапрыемствах, вучэбна-даследчай, навукова-даследчай працы студэнтаў (канферэнцыях, семінарах, алімпіядах, конкурсах, навуковых гуртках і г.д.) па профілю дысцыпліны і можа быць павышана да 10 балаў пры дасягненні значных вынікаў у гэтай працы.

Пры правядзенні міжсесійнай атэстацыі ў адпаведнасці з графікам навучальнага працэсу ў рэйтынгавую (атэстацыйную) ведамасць уносіцца бягучая адзнака па дзесяцібальнай шкале, выведзеная па выніках мерапрыемстваў бягучага кантролю, праведзеных з пачатку семестра да моманту атэстацыі.

Пры правядзенні прамежкавай атэстацыі (заліку) адзнака «залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі па накапляльнай сістэме па выніках мерапрыемстваў бягучага кантролю выніковую адзнаку ад 4 да 10 балаў,адзнака «не залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі ад 1 да 3 балаў. Апошнія здаюць залік другі раз па прапанаваных пытаннях да заліку.

**ПРАТАКОЛ ЎЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва дысцыпліны, зякой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесцевучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне,прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты інумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя беларускай дзяржаўнасці | Кафедра сусветнай літаратуры і замежных моў | няма | |

Загадчык кафедры
сусветнай літаратуры і
замежных моў,
к.ф.н, дацэнт                Е.У. Лушнеўская